# Экалагічная палітыка A1.





Стратэгія развіцця А1 будуецца ў адпаведнасці з прынцыпамі экалагічнага, сацыяльнага і карпаратыўнага кіравання (Environmental, Social and Corporate Governance). Кампанія вызначыла некалькі прыярытэтных кірункаў – экалагічныя паводзіны, дапамога дзецям, павышэнне лічбавай граматнасці, падтрымка нацыянальнай культуры, развіццё інклюзіўнага грамадства. Вядзенне сацыяльна адказнага бізнэсу для нас – гэта не толькі адзін з асноўных прынцыпаў працы, але і магчымасць ісці па шляху ўстойлівага развіцця, мяняцца і мяняць свет вакол сябе да лепшага, звяртаць увагу на тое, што лічым важным, а таксама дапамагаць тым, каму гэта неабходна, клапаціцца аб навакольным асяроддзі.

На глабальным узроўні А1 імкнецца да таго, каб мінімізаваць уздзеянне на экалогію за кошт ужывання энергаэфектыўных сістэм і налад для абслугоўвання сетак сувязі і іх кампанентаў, скарачэнні «вугляроднага следа» за кошт выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі, граматнага кіравання рэсурсамі і адходамі, што ў канчатковым выніку прыводзіць да адчувальнага выніку для навакольнага асяроддзя.

Мы верым, што кожны крок на гэтым шляху, вялікі і маленькі, дапамагае рухацца да дасягнення адзінай мэты, і імкнемся захапіць ідэяй беражлівага стаўлення да прыроды і экалагічных паводзінаў нашых супрацоўнікаў, кліентаў і партнёраў, а таксама ўсіх, для каго важна, які свет мы пакінем пасля сябе будучым пакаленням. У сваю чаргу, мы спадзяемся, што нашы імкненні і дзеянні зробяць свой унёсак у агульную справу клопату аб навакольным асяроддзі, а А1 стане вартым прыкладам для іншых бізнесаў у Беларусі.

**Гельмут Дуз**,
генеральны дырэктар А1



# 1. Прызначэнне.

Экалагічная палітыка Унітарнага прадпрыемства па аказанні паслуг «А1» (далей – «Палітыка») устанаўлівае патрабаванні да кіравання дзейнасцю Унітарнага прадпрыемства па аказанні паслуг «А1» (далей – «А1» ці «кампанія»), якая заклікана мінімізаваць уздзеянне на навакольнае асяроддзе.

Дадзеная Палітыка заснавана на інтэграцыі прынцыпаў экалагічнага, сацыяльнага і карпаратыўнага кіравання (ESG – Environmental, Social and Corporate Governance, а далей «прынцыпаў ESG») у стратэгію ўстойлівага развіцця кампаніі і распрацавана з мэтай устанаўлення асноўных прынцыпаў і задач А1 у галіне аховы навакольнага асяроддзя і забеспячэння экалагічнай бяспекі, шляхоў і механізмаў іх рэалізацыі.

Палітыка ўводзіцца ў дзеянне з даты яе зацвярджэння і распаўсюджваецца на ўсіх супрацоўнікаў А1, а таксама знаходзіць сваё адлюстраванне ва ўсіх аспектах дзейнасці кампаніі.



# 2. Агульныя палажэнні.

А1 – правайдэр тэлекамунікацыйных, ІКТ- і кантэнт-паслуг у Беларусі. Камерцыйную дзейнасць кампанія пачала 16 красавіка 1999 г., стаўшы першым мабільным аператарам стандарта GSM у краіне. Да жніўня 2019 г. кампанія вяла аперацыйную дзейнасць пад таварным знакам velcom.

Абанентамі мабільнай сувязі А1 у Беларусі з'яўляюцца больш за 4,9 мільёнаў чалавек, больш за 1 мільён хатніх гаспадарак маюць магчымасць доступу да сеткі фіксаванай сувязі па тэхналогіях GPON і Ethernet у абласных гарадах і буйных раённых цэнтрах. Акрамя таго, А1 прадастаўляе паслугі лічбавага тэлебачання IPTV пад таварным знакам VOKA, а таксама паслугі захоўвання дадзеных і воблачныя сэрвісы на базе ўласнага дата-цэнтра, аднаго з найбуйнейшых у краіне. У кампаніі працуе больш за 2600 чалавек, а нашы крамы размешчаны ў многіх буйных населеных пунктах краіны.

А1 ідзе па шляху ўстойлівага развіцця і актыўна рэалізуе сацыяльна значныя праекты ў адпаведнасці з прынцыпамі ESG. Адным з ключавых прыярытэтаў кампаніі з'яўляецца важны кірунак – экалогія.

А1 надае асаблівае значэнне паляпшэнню экалогіі і навакольнага асяроддзя як асновы ўстойлівага развіцця бізнесу, дзяржавы і грамадства і разглядае экалагічны аспект як адзін з галоўных прынцыпаў сваёй дзейнасці.

А1 ацэньвае дзейнасць па ахове навакольнага асяроддзя як неад'емную частку сваёй паўсядзённай працы, у поўнай меры ўсведамляючы неабходнасць падтрымання экалагічнай раўнавагі, забеспячэння экалагічна стабільнага сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства.



Пры ажыццяўленні сваёй дзейнасці А1 усведамляе адказнасць за захаванне навакольнага асяроддзя, бяспеку і надзейнасць пры выкананні абавязацельстваў у рамках прыярытэтаў, замацаваных дадзенай Палітыкай, а таксама прымае на сябе абавязацельствы па мінімізацыі дадзенага ўздзеяння, уліку яго наступстваў, магчымай кампенсацыі нанесенага ўрону.

Абавязацельствы і стратэгічныя мэты, вызначаныя ў гэтай Палітыцы А1, скіраваны на забеспячэнне захавання спрыяльнага навакольнага асяроддзя і прыродна-рэсурснага патэнцыялу.

# 3. Прынцыпы.

- Захаванне ў працэсе дзейнасці А1 устаноўленых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і ратыфікаванымі міжнароднымі дагаворамі патрабаванняў, норм, абавязацельстваў у галіне ахновы навакольнага асяроддзя, рацыянальнага прыродакарыстання, экалагічнай бяспекі.

- Прыхільнасць да прынцыпаў устойлівага развіцця пры планаванні і ажыццяўленні дзейнасці А1: рэалізацыя А1 сваіх эканамічных інтарэсаў не павінна пагаршаць існуючую экалагічную сітуацыю, якасць жыцця і здароўя насельніцтва, прыводзіць да нанясення шкоды навакольнаму асяроддзю, асобным яго кампанентам.

- Адсутнасць перашкод да рэалізацыі супрацоўнікамі А1, а таксама грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, закранутымі дзейнасцю А1, свайго канстытуцыйнага права на спрыяльнае навакольнае асяроддзе.

- Улік патэнцыйных экалагічных рызык пры прыняцці кіраўніцкіх рашэнняў, якія вызначаюць стратэгію развіцця А1. Улік эколага-эканамічных і прыродаахоўных аспектаў нароўні з традыцыйнымі фінансава-эканамічнымі параметрамі.

- Павышэнне энергетычнай эфектыўнасці і вырашэнне праблемы энергазберажэння ў комплексе мер.

- Забеспячэнне скарачэння выкідаў $CO_2$ у выніку дзейнасці кампаніі; папярэджанне і памяншэнне негатыўнага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе ў працэсе дзейнасці А1; прыняцце ўсіх магчымых мер па кампенсацыі прычыненага ёй урону.

- Скарачэнне ўтварэння адходаў і экалагічна бяспечнае абыходжанне з імі.

- Адкрытасць і даступнасць вынікаў экалагічнага маніторынгу для ўсіх зацікаўленых асоб.

- Стварэнне і развіццё ў А1 экалагічнай культуры, экалагічных каштоўнасцяў, фарміраванне іміджу А1 як экалагічна арыентаванай кампаніі, стратэгія развіцця якой будуецца ў адпаведнасці з прынцыпамі ESG.



# 4. Мэта і задачы.

**Мэта** гэтай Палітыкі – павышэнне ўзроўню экалагічнай бяспекі, комплексны падыход да рацыянальнага выкарыстання энергетычных і прыродных рэсурсаў, мінімізацыя шкоды навакольнаму асяроддзю ад дзейнасці А1, захаванне спрыяльнага навакольнага асяроддзя для будучых пакаленняў, пазіцыянаванне ў грамадстве А1 як экалагічна арыентаванай кампаніі.

Дадзенай Палітыкай вызначаны прыярытэтныя кірункі дзейнасці:

- энергаэфектыўнасць і энергазберажэнне;
- прамое скарачэнне выкідаў вуглякіслага газу ў атмасферу;
- памяншэнне смеццевага следу.

Для кожнага з іх у А1 распрацаваны і ажыццяўляецца комплекс канкрэтных мер на 2021–2025 гг. з магчымасцю далейшай пралангацыі.

**Задачы і спосабы іх рэалізацыі:**

1. Энергаэфектыўнасць і энергазберажэнне:

- Паступовы пераход на аднаўляльныя крыніцы энергіі і павелічэнне іх долі ў структуры энергаспажывання. Выкарыстанне экалагічна бяспечных крыніц энергіі, напрыклад, фотаэлектрычных панэляў і інш.

- Укараненне на аб'ектах А1 энергазберагальных і рэсурсазберагальных тэхналогій. Рэалізацыя мерапрыемстваў па энергазберажэнні (напрыклад, прымяненне метаду натуральнага астуджэння абсталявання, мадэрнізацыя электрасілкавальных установак (ЭСУ), павышэнне дапушчальнага ўзроўню тэмпературы ў кантэйнерах з абсталяваннем базавых станцый і інш.).

- Тэхналагічнае пераабсталяванне і паступовы вывад з эксплуатацыі састарэлага абсталявання (у тым ліку паэтапны адыход ад выкарыстання абсталявання стандарта 2G), укараненне найлепшых існуючых тэхналогій у рабоце А1.



▪ Зніжэнне ўдзельнага энергаспажывання ў працэсе аказання паслуг. Зніжэнне долі дапаможных працэсаў у агульным энергетычным балансе А1 (напрыклад, забеспячэнне адаптыўнай працы сеткавага абсталявання мабільнай сеткі ў тыя інтэрвалы часу, калі нагрузка на сетку мінімальная, і дасягненне энергаэфектыўнага рэжыму працы без пагаршэння кліенцкага сэрвісу).

2. Прамое скарачэнне выкідаў вуглякіслага газу ў атмасферу:

▪ Скарачэнне ўласнага аўтапарка кампаніі.

▪ Змяншэнне колькасці камандзіровак (на самалёце і аўтамабілі).

▪ Стымуляванне выкарыстання зялёнага транспарта, у т.л. праз павелічэнне колькасці велапарковак каля офісаў і іншых аб'ектаў кампаніі.

3. Памяншэнне смеццевага следу:

▪ Скарачэнне ўтварэння адходаў і забеспячэнне бяспечнага абыходжання з імі, забеспячэнне раздзельнага збору адходаў, павышэнне ўзроўню іх сартавання (у выпадку наяўнасці тэхнічнай магчымасці ў канкрэтным рэгіёне і эканамічнай мэтазгоднасці) шляхам інфармавання супрацоўнікаў і ўстаноўкі спецыяльных кантэйнераў для раздзельнага збору смецця.

▪ Перадача для перапрацоўкі іншым арганізацыям па магчымасці ўсіх відаў утвораных адходаў, якія дапускаюць другаснае выкарыстанне.

▪ Паступовы пераход ад біяраскладальных пакетаў у цэнтрах продажаў і абслугоўвання, дылерскай сеткі, інтэрнэт-крамах і для B2B-сэрвісу на ўпаковачныя матэрыялы з больш высокім экалагічным індэксам.

▪ Скарачэнне спажывання паперы і фарбы для прынтэраў унутры кампаніі і пры працы з кліентамі (капіявання, друку, рахункаў і г.д.) за кошт прасоўвання электроннага дакументазвароту.

▪ Укараненне eSim – электронных SIM-карт.

4. Прыярытэт папераджальна-прафілактычных мер у працэсе мінімізацыі наступстваў негатыўных уздзеянняў:

▪ Улік экалагічных рызык і магчымых экалагічных наступстваў на этапе праектавання, стратэгічнага планавання дзейнасці.

▪ Улік экалагічных патрабаванняў пры правядзенні закупак тэхналогій, матэрыялаў і абсталявання, выканання работ і паслуг падрадчыкамі.

▪ Прыярытэтнае выкарыстанне матэрыялаў, тэхналогій і абсталявання, бяспечных для навакольнага асяроддзя, сертыфікаваных у адпаведнасці з беларускімі і міжнароднымі экалагічнымі стандартамі.

5. Адкрытасць і даступнасць экалагічнай інфармацыі:

▪ Публікацыя гэтай Палітыкі на афіцыйным сайце А1. Давядзенне гэтай Палітыкі і ўсіх звязаных з ёй дакументаў да ведама ўсіх супрацоўнікаў А1.

▪ Інфармаванне грамадскасці на афіцыйным сайце А1 аб рэалізацыі механізмаў экалагічнай адказнасці, прадугледжаных дадзенай Палітыкай і прынятых у яе развіццё ўнутраных нарматыўных дакументаў.

6. Стварэнне і развіццё экалагічнай культуры, экалагічных каштоўнасцяў у А1:

▪ Ажыццяўленне інфармацыйнай падтрымкі мерапрыемстваў адукацыйнай, асветніцкай скіраванасці ў сферы аховы навакольнага асяроддзя, рацыянальнага прыродакарыстання, запаведнай справы, аховы рэдкіх відаў раслін і жывёл.

▪ Забеспячэнне ўдзелу прадстаўнікоў А1 у грамадскіх слуханнях, публічных абмеркаваннях экалагічных ініцыятыў, праектаў нарматыўных актаў, якія закранаюць дзейнасць А1 у тых выпадках, калі гэта ўяўляецца магчымым.



▪ Укараненне канцэпцыі «Зялёны офіс» у арганізацыю працоўнай прасторы А1 з дапамогай розных ініцыятыў па фарміраванні экалагічных звычак сярод супрацоўнікаў усіх офісаў, крам і іншых аб'ектаў А1, уключаючы стымуляванне і матывацыю да фарміравання асабістых экалагічных звычак.

▪ Абавязацельства дзейнічаць адпаведна прынцыпам, мэтам і задачам гэтай Палітыкі А1 пры прэзентацыі прадуктаў і паслуг, узаемадзеянні з кліентамі, контрагентамі і іншымі кантактнымі асобамі.

▪ Матывацыя супрацоўнікаў А1 да ўдзелу ў мерапрыемствах па ахове навакольнага асяроддзя. Арганізацыя экалагічнай асветы сярод супрацоўнікаў А1 сродкамі карпаратыўных інфармацыйных рэсурсаў.

▪ Удзел А1 у экалагічных акцыях, якія праводзяцца арганізацыямі і ўстановамі, некамерцыйнымі і камерцыйнымі арганізацыямі, грамадскімі аб'яднаннямі.



# 5. Абмежаванні прымянімасці.

Задачы і спосабы іх рэалізацыі, пералічаныя ў раздзеле 4 гэтай Палітыкі, не могуць быць рэалізаваны ў наступных выпадках:

- Адсутнасць тэхнічнай магчымасці іх рэалізацыі ў канкрэтным рэгіёне, дзе ажыццяўляецца дзейнасць А1.

- Вельмі нізкая або нулявая экалагічная эфектыўнасць па незалежных ад дзейнасці А1 прычынах знешняга характару.

- Па іншых прычынах знешняга характару, якія не залежаць ад дзейнасці А1.



# 6. Адказнасць.

Усе кіраўнікі падраздзяленняў А1 адказныя за дасягненне выкладзеных у дадзенай Палітыцы мэтаў, скіраваных на павышэнне ўзроўню экалагічнай бяспекі, фарміраванне комплекснага падыходу да рацыянальнага выкарыстання энергетычных і прыродных рэсурсаў, мінімізацыю ўрону навакольнаму асяроддзю ад дзейнасці А1, пазіцыянаванне А1 як экалагічна арыентаванай кампаніі.



# 7. Заключныя палажэнні.

Дадзеная Палітыка выказвае пазіцыю A1 у адносінах да навакольнага прыроднага асяроддзя і рэалізацыі прынцыпаў ESG, з'яўляецца асновай для вызначэння экалагічнай стратэгіі кампаніі, мэтавага планавання яе дзейнасці ў сферы экалогіі на кароткатэрміновы, сярэднетэрміновы і доўгатэрміновы перыяды.

Дадзеная Палітыка падлягае своечасоваму перагляду, унясенню карэкціровак і ўдасканаленню пры змяненні знешніх умоў, а таксама прыярытэтаў развіцця і ўмоў дзейнасці кампаніі.